У мультфільме кажуць пра жыватворную энергію Цы. Гэта можна ўзяць за прыклад, каб растлумачыць дзецям, што трэцяя Асоба Святой Тройцы - Святы Дух Жыватворчы. Нам, дарослым, прасцей зразумець, што абазначае слова «Жыватворчы», але далёка не кожнае дзіця разважае так, як дарослыя. Майстар Шыфу, расказваючы По пра Цы, накіраваў яе на абвялую кветку, якая адразу заквітнела, ажыла. Усё жывое ў нашым свеце жыве і існуе дзякуючы падтрымцы Святога Духа. Менавіта Бог перадае ўсяму жыватворную энергію, ці па-іншаму жыццё.



У праваслаўным «Сімвале веры» кажуць, што мы верым у Духа Святога, Госпада, Жыватворчага, што АД АЙЦА ЗЫХОДЗІЦЬ. Менавіта Лі Шань, бацька панды По першым прапанаваў накіраваць Цы, каб дапамагчы свайму сыну ў барацьбе з Каем у свеце духаў. Цы накіравалі не толькі Лі Шань, але і астатнія. Так і Дух Святы можа праявіць сябе ў кожным чалавеку. Плады гэтай праявы — любоў, радасць, мір, доўгацярпенне, дабрыня, міласэрнасць, вера, пакорнасць, устрыманне. (Гал. 5, 22).

Пасля няўдалага дэбюту По ў навучанні Апантанай Пяцёркі прыёмам кунг-фу Майстар Шыфу тлумачыць Воіну Дракона, што Угвэй зрабіў свой выбар «насуперак здароваму сэнсу». Гэта адбылося яшчэ ў першай частцы менавіта дзякуючы таму, што По зваліўся, як кажуць, у патрэбным месцы ў патрэбны час, то бок проста перад указальным пальцам Угвэя. Потым ён прамовіць выдатную фразу: «Выпадковасці не выпадковыя». Гэта сапраўды так, таму што ў нашым свеце дзейнічае наканаванне Божае. Гасподзь клапоціцца аб усіх людзях і кожным чалавеку. Бог найвялікшы стратэг, хоць у нас часам у галаве не ўкладваецца, як можна рабіць такія стратэгічныя хады. Так і маленькае дзіця можа не разумець, чаму яго любімая маці (якая, скажам, медык) робіць яму балючы ўкол. Дзіця адчувае боль, і яму вельмі цяжка растлумачыць, што яму стане лепей. З неразуменнем глядзелі на Угвэя Майстар Шыфу з Апантанай Пяцёркай, а таксама ўсе гледачы, якія сабраліся. Аднак менавіта «вялізная і тлустая панда» (так пагарачыўшыся назвала По лепшы баец з пяцёркі Тыгрыца) аказалася адзіным выратавальнікам для Даліны Міру, для ўсяго Кітая і яго сакрэтнай вёскі. У канцы мультфільма ў свеце духаў Угвэй прызнаўся По, што пры першай іх сустрэчы ўбачыў у По будучыню кунг-фу… і мінуўшчыну. Ён убачыў панду, якая можа звязаць іх у адно.

У трэцяй частцы фігуруе адмоўны герой Кай, які быў калісьці лепшым сябрам Угвэя, братам па зброі. Яны змагаліся разам плячо да пляча. Аднак у Кая з'явілася вельмі нядобрае жаданне прысвоіць усю сілу Цы. Угвэю прыйшлося пазмагацца з Каем. Бойка была настолькі моцнай, што нават зямля скаланулася. У выніку Угвэй адправіў Кая ў свет духаў. Гэта проста як у вярхоўнага анёла Дзеніцы з'явілася зусім нядобрае жаданне стаць вышэй за Бога. Вось і прыйшлося Архангелу Міхаілу ўзначаліць анёльскае войска супраць Дзеніцы і спакушаных ім анёлаў (нячысцікаў). Мы можам толькі ўяўляць маштабы той бітвы між светлымі і паўшымі анёламі. Але ў выніку Архангел Міхаіл адправіў д'ябла (былога Дзеніцу) разам з нячысцікамі ў апраметную.

Майстар Шыфу адсылае ў разведку Жураўля і Багамола і дае строгі наказ не ўступаць у бой з Каем. Багамол з Жураўлём не змаглі ўтрымацца і ўсё ж такі пачалі бойку. У выніку абодва разведчыкі трапілі ў рабства да Кая. Вось выдатны прыклад таго, да чаго можа прывесці непаслухмянства. Бо забарона Майстра Шыфу мела пэўны сэнс: «З кожнага паядынку з ворагам Кай выходзіць мацнейшы, чым быў». Таксама і нам Бог даў пэўныя запаведзі, якія ўскладаюць на нас пэўныя забароны, але яны не бессэнсоўныя. Парушаючы запаведзі Божыя, мы грашым, а як казаў Гасподзь Ісус Хрыстос: «Усялякі, хто робіць грэх, ёсць раб граху» (Ін. 8, 34)

Кай разбурае Нефрытавы палац — месца, дзе жывуць і трэніруюцца байцы з Апантанай Пяцёркі. Палац выконваў не проста функцыю спартзалы, ён служыў своеасаблівым помнікам Угвэю, заснавальніку кунг-фу. Майстар Шыфу, убачыўшы сваімі вачыма страшнае разбурэнне, сказаў прароцкія словы: «Ты знішчыў Нефрытавы палац, але ты не атрымаеш перамогу». Тут можна пагутарыць з старэйшымі дзецьмі і расказаць ім пра ганенні на праваслаўных. Так, напрыклад, у XX стагоддзі ў камуністычнай Албаніі ўсе праваслаўныя храмы былі альбо разбураны, альбо закрыты. Але бязбожныя ўлады не здолелі ўтрымаць перамогу. Пасля падзення камуністычнага рэжыму царкоўнае жыццё ў Албаніі змагло адрадзіцца. Бо сказаў жа Хрыстос «Я ствару Царкву Маю, і брама пекла не здужае яе» (Мф. 16, 18).

По здолеў падкрасціся да Кая, каб выкарыстаць адменны прыём пальцавы захоп Усі. Аднак аказалася, што гэта дзейнічае толькі на смяротных, а Кай паўстаў з свету духаў. Так і д'ябла нельга перамагчы пры дапамозе мышцаў і агнястрэльнай зброі, як гэта часта бывае ў сучасных баевіках. «Гэты ж род выганяецца толькі малітвай і пастом»,

— чытаем мы ў Евангеллі (Мф. 17, 21). Сапраўды, ты можаш быць фізічна вельмі моцным, але калі ў цябе не будзе звароту розуму і сэрца да Бога (што, па сутнасці, з'яўляецца малітвай) і дабрачыннага жыцця, то ніякія баявыя прыёмы не дапамогуць перамагчы д'ябла і яго спакусы.

Адправіць Кая ў свет духаў не атрымалася, але По здагадаўся, што можна адвесці. Заскокнуўшы да Кая на шыю, По выконвае пальцавы захоп Усі сам сабе і адпраўляецца ў свет духаў разам з Каем. Тут яўная аналогія з дабравольнай збавіцельнай хроснай ахвярай Ісуса Хрыста, Які памёр за ўсіх нас на крыжы.

«По выратаваў нас, а хто выратуе яго?» — пытаў гусак Пін, разумеючы, што быццё По з наступленнем фізічнай смерці не скончылася. Як ужо згадвалася, Лі Шань першым прапанаваў накіраваць сваю Цы, каб дапамагчы По. Гэта падтрымка была неабходнай, і гэта сапраўды дапамагло. Атрымліваецца, што малітва за тых, каго ўжо з намі няма, то бок нябожчыкаў зусім не бессэнсоўная. Яны сапраўды маюць патрэбу ў нашай малітоўнай падтрымцы.

У свеце духаў здзіўлены Кай пытае:

— Хто ж ты?
— Я задаваў сабе тое ж пытанне. Я сын панды, сын Гусака, вучань, настаўнік, а я ўсё гэта разам.

«Ці не цесляроў Ён сын? Ці не Яго Маці называецца Марыя…» (Мф. 13, 55). Шмат хто здзіўляўся, калі чуў пропаведзь Хрыста і бачыў цуды, якія ён здзяйсняў. Дык кім жа з'яўляецца Ісус Хрыстос? Ён і Сын Чалавечы, і Сын Божы адначасова. Другая Асоба Святой Тройцы робіцца чалавекам, не перастаючы быць Богам, гэта значыць робіцца богачалавекам. Пасля ўчалавечвання боская і чалавечая прыроды ў Хрысце злучыліся нязлучна, нязменна, непадзельна і неразлучна. Гэту дагматычную ісціну далёка не кожны дарослы можа для сябе засвоіць, што ўжо казаць пра дзяцей. Але можна паспрабаваць растлумачыць ім гэтыя чатыры прыслоўі на прыкладзе По.

НЯЗЛУЧНА, гэта значыць, не адбылося ніякага злучэння боскай і чалавечай прыроды. По застаўся сынам панды і сынам гусака, а стаў сынам пандгусака.

НЯЗМЕННА, гэта значыць, не было ніякіх змен ні боскай прыроды, ні чалавечай. По не стаў менш любіць Піна, а Лі Шаня больш. Галоўны герой абодвух бацькоў працягваў любіць аднолькава моцна.

НЕПАДЗЕЛЬНА, гэта значыць, боская і чалавечая прыроды аб'ядналіся ў АДНОЙ асобе. Хоць татаў было два, але По быў адзін і да абодвух бацькоў адчуваў сынавы пачуцці.

НЕРАЗЛУЧНА — Бог аб'яднаўся з чалавечым целам назаўсёды. Адправіўшыся ў сакрэтную вёску са сваім сапраўдным бацькам пандай Лі Шанем, По не разлучыўся з прыёмным — гусаком Пінам, які рушыў услед за імі.

Пасля смерці на крыжы душа Ісуса Хрыста накіравалася ў пекла, таму што туды траплялі душы ўсіх людзей, якія жылі ў дахрысціянскую эпоху. Пекла не змагло змясціць у сабе Самога Бога і было разбурана знутры. Так жа як і Кай не здолеў змясціць у сабе Цы, якую ён не адабраў сілай, якую Воін Дракона аддаў яму добраахвотна. Хрыстос таксама добраахвотна аддаў Сябе на раскрыжаванне.

У час Свайго пасланняя ў пекла Хрыстос вывеў адтуль душы старазапаветных праведнікаў, якія таміліся ў чаканні Збаўцы. Атрымаўшы канчатковую перамогу над Каем, По вызваліў усіх Майстроў кунг-фу, Цы якіх (то бок душы) былі заняволены Каем.

Калі іншыя Майстры кунг-фу вярнуліся ў свет смяротных дзякуючы заслугам По, то сам По вяртаецца без чужой дапамогі. Да Ісуса Хрыста таксама былі выпадкі ўваскрэсення, але ўсіх ажыўшых уваскрашаў хтосьці, напрыклад, пракрокі ці, напрыклад, Хрыстос за час Свайго зямнога служэння таксама здзяйсняў цуд уваскрашэння. Але Сам Збаўца ўваскрэс без чужой дапамогі.

З а к а н ч в а е ц ц а мультфільм тым, што По вучыць кунг-фу не толькі байцоў з Апантанай Пяцёркі, а абсалютна ўсіх. У дахрысціянскую эпоху вера ў праўдзівага Бога была ўласцівая толькі канкрэтнаму богавыбранаму ізраільскаму народу. Хрысціянская ж Царква не мае меж ні нацыянальных, ні расавых, ні дзяржаўных, ні якіх-небудзь. Заклік стаць хрысціянамі гучыць абсалютна для ўсіх.

Не толькі трэцюю частку гэтага мультфільма можна выкарыстоўваць у якасці нагляднага дапаможніка. У першых дзвюх таксама ёсць моманты, за якія можна зачапіцца. Так, напрыклад, у другой частцы галоўная ідэя — гэта здабыццё ўнутранага спакою. По доўга спрабаваў здабыць яго, але ўсе спробы былі дарэмныя, пакуль ён проста не пакінуў усе свае крыўды лорду Шэню за тое, што той пакінуў яго без бацькоў. Тут раскрываецца тэма даравання і ўнутранага супакаення, то бок незласлівасць. Бо ўсім вядомыя словы св. Серафіма Сароўскага: «Прыдбай (то бок назапась) дух мірны і вакол цябе выратуюцца тысячы». У мультфільме менавіта так і адбылося. Дзякуючы таму, што Воін Дракона дасягнуў унутранага спакою і незласлівасці (то бок мірнага духу), гэта паслужыла выратаваннем для ўсяго Кітая.

У першай частцы, калі будзеце глядзець ці пераглядваць, завастрыце сваю ўвагу на паядынку Майстра Шыфу з Тай Лунгам. Раз'юшаны Тай Лунг пытае, ці ганарыўся Майстар Шыфу ім, бо ён як вучань усё зрабіў для гэтага. Абяссілены Майстар Шыфу адказаў, што заўсёды ганарыўся, і гонар яго асляпіў, што ён нават не заўважыў, у што ператварыўся яго вучань, а дакладней у што ён ператварае свайго вучня. Вось яно як бывае, калі ў вучня ганарыстасць, а ў Майстра празмерны гонар. Не здарма ж у Бібліі напісана: «Пачатак граху — гонар» (Сір. 10, 15). Менавіта з-за свайго гонару вярхоўны анёл Дзеніца ўпаў і стаў д'яблам.

У самым пачатку я пазначыў, што гэты мульцік цудоўна можа падысці ў якасці наглядных прыкладаў пры гутарцы з дзецьмі. Увогуле мульцікі глядзяць не толькі дзеці.

Я не прэтэндую, каб гэты артыкул стаў нейкай рэцэнзіяй на мультфільм. Хай ён застанецца місіянерскай глінай.

Калі робіш толькі тое, што ўмееш, ніколі не перасягнеш самога сябе.

Святар Аляксандр БОГДАН



Максім Багдановіч як інтэрпрэтатар культуры

Слова «інтэрпрэтацыя» з лацінскай мовы перакладаецца як тлумачэнне, або пасрэдніцтва. У гэтым сэнсе Максім Багдановіч – сапраўдны інтэрпрэтатар. Ён бярэ на сябе ролю пасрэдніка паміж беларускай культурай і культурай астатняга свету, каб растлумачыць суайчыннікам: без далучэння Беларусі да сусветных каштоўнасцей адраджэнне краіны немагчымае. Пра гэта наш тэкст.

Гаварыць пра Максіма Багдановіча як пра інтэрпрэтатара, гэта не значыць разглядаць яго толькі як перакладчыка. Хаця, звычайна, калі гаворка ідзе пра пасрэдніцтва ў літаратуры, звычайна маецца на ўвазе перакладчыцкая дзейнасць. Безумоўна, М. Багдановіч бліскуча ўзнаўляў па-беларуску Авідзія, Гарацыя, Поля Верлена, Генрыха Гейнэ, Фрыдрыха Шылера і іншых еўрапейскіх паэтаў, ніколі не сумняваючыся ў тым, што добры твор узбагачае не толькі тую літаратуру, дзе ён узнік, але і тую літаратуру, дзе працягвае сваё жыццё ў выглядзе перакладу. У гэтым сэнсе М. Багдановіч, вядома, выступае як інтэрпрэтатар, пасрэднік паміж замежнай і айчыннай літаратурай. Усведамляючы важнасць далучэння айчыннага прыгожага пісьменства да скарбаў сусветнага вербальнага мастацтва праз пераклады, рыхтаваў М. Багдановіч і першы зборнік вершаў. Перакладам, якіх назбіралася нямала, паэт планаваў адвесці апошні аддзел кнігі і назваць яго "З чужой глебы". На жаль, задума не была рэалізаванай. У «Вянок» упляліся толькі невялічкі ўрывак з «Метамарфозаў» Авідзія (верш «Грамада зорак «Карона») і тры перакладныя вершы з украінскай мовы: Агафангела Крымскага, Мікалая Чэрняўскага і Алеся (Аляксандра Кандыбы).

Але, як мы ўжо адзначылі, Багдановіч-перакладчык не зусім тоесны Багдановічу-інтэрпрэтатару. Нават калі не ўлічваць згаданыя пераклады Авідзія і ўкраінскіх паэтаў, аўтар «Вянка» і так рэалізаваў сябе як інтэрпрэтатар. І тут не маецца на ўвазе інтэрпрэтацыя М. Багдановічам, напрыклад фальклорных вобразаў ці матываў, эстэтычных ці маральных ідэй. Хаця і гэта таксама дазваляе нам гаварыць пра паэта ў герменеўтычным кантэксце. Пасрэднікам паміж беларускай культурай і другімі культурамі М. Багдановіч становіцца дзякуючы шматлікім эпіграфам, якімі наш паэт шчодра аздабляе свае творы. У «Вянку» сустракаем эпіграфы, узятыя ад пятнаццаці аўтараў, прадстаўнікоў рускай, французскай, італьянскай, нямецкай, польскай і беларускай літаратуры. Найбольш эпіграфаў, дарэчы, было пазычана ад рускіх і французскіх аўтараў. З аднаго боку, эпіграфы сведчаць усяго толькі аб захапленні М. Багдановічам тымі ці іншымі замежнымі пісьменнікамі, але ж з іншага боку, эпіграфы дазвалялі беларускаму чытачу «пачуцца заадно» з вядомымі на ўвесь свет творцамі. Цікава і тое, што аўтары эпіграфаў істотна адрозніваюцца паміж сабой, незалежна ад прыналежнасці іх да адной нацыянальнай літаратуры. Так, Францыю, напрыклад, прадстаўляюць цалкам розныя творцы – Поль Верлен, Сюлі-Пруд



(Рэнэ Франсуа Арман Пруд), Віктор Гюго, Нікала Буало, Шарль Агюстэн Сент-Бёў. Расія прадстаўлена Афанасіем Фетам, Аляксандрам Пушкіным, Валерыем Брусавым, Яўгенам Баратынскім і Канстанцінам Фафанавым. Прычым, з А. Фета, А. Пушкіна і В. Брусава эпіграфы ўзяты двойчы. Італьянскую літаратуру «прэзентуюць» і часава і эстэтычна аддаленыя Дантэ Аліг'еры і Джавані Праці. Ёсць таксама ў «Вянку» радкі немца Генрыха Гейнэ, паляка Францішка Жыгліньскага і беларуса Янкі Купалы. Як бачым, «кампанія» ў апошняга атрымалася вельмі прыстойная. І, канешне, беларускі паэт не выпадкова патрапіў у «аўтары эпіграфаў» для зборніка М. Багдановіча. Гэта быў чарговы, добра прадуманы крок да збліжэння «беларускага» і «еўрапейскага». Ролю ж пасрэдніка паміж імі, або інтэрпрэтатара бярэ на сябе аўтар «Вянка». Варта таксама дадаць, што кожны верш М. Багдановіча, укаранаваны эпіграфам, гэта яшчэ і арыгінальная інтэрпрэтацыя, тлумачэнне пэўнай думкі, выказанай тым ці іншым творцам.

Аднак ёсць у творчай спадчыне М. Багдановіча яшчэ адна рэч, якая дазваляе казаць пра яго як пра інтэрпрэтатара. На ўвазе маецца цыкл вершаў «Песні», у які ўвайшлі творы (песні) «Сербская», «Руская», «Украінскія», «Скандынаўская», «Іспанскія», «Японскія», «Персідскія». Пры жыцці аўтара гэты цыкл не друкаваўся, магчыма, па прычыне незавершанасці. Упершыню быў апублікаваны ў 1927 годзе з аўтографаў, датаваных 1915 г.: Творы М. Багдановіча: У 2-х т. (Пад рэд. І. І. Замоціна). Мн.: Выд-ва Інбелкульта., 1927 – 1928.

Дадзены цыкл у большай ступені, чым іншыя творы М. Багдановіча, арыгінальныя і перакладныя, адпавядае мастацка-эстэтычнай праграме паэта па далучэнню «беларускага» да «сусветнага» і наадварот. Дарэчы, «Песні» доўгі час лічыліся дакладным перакладам аўтэнтычных фальклорных твораў, хоць насамрэч гэта толькі паэтычнае наследаванне. Як вядома, пераклад заўсёды прайграе арыгіналу, бо не магчыма цалкам узнавіць ідэйна-вобразную структуру іншамоўнага твора, яго «унутранае жыццё». У «Песнях» гэтая стыхія не аднаўляецца, але нанова ствараецца М. Багдановічам на аснове мастацка-эстэтычных законаў і прынцыпаў, на якіх грунтуецца творчая свядомасць, асновы светасузірання, ментальнасць нашых блізкіх і далёкіх суседзяў. Так, напрыклад, у песні «Сербскай», з якой распачынаецца цыкл, ужо з першых радкоў выбудоўваецца выключна сербская парадыгма вобразаў і матываў: з'яўляецца вобраз Косавага поля, як сімвал сербскай мужнасці і трагедыі (у 1389 на Косавым полі сербы пацярпелі паразу ў бітве з туркамі, пасля чаго адбыўся хуткі заняпад краіны і страта дзяржаўнасці), вобраз дэлібаша, ліхога наезніка, які гіне з-за сваёй зухаватасці. Прыгадаем, што пасля падзей на Косавым полі ў сербскай старажытнай літаратуры ўзнік так званы «косаўскі цыкл», які праслаўляў адвагу сербскіх ваяроў, удзельнікаў бітвы. Гэты цыкл стаў асноўнай крыніцай народнага песеннага эпасу. М. Багдановіч таксама апявае адвагу героя, праўда яго героем становіцца шэршань:

Хто там едзе па Касову полю?
Едзе ў полі дэлібаш адважны -
Слаўны шэршань на жуку рагатым.
Дзень ён едзе, і другі, і трэці,
На чацверты к мору пад'язджае,
Што калюжай у людзей завецца.

Аднак прыём алегорыі, ужыты беларускім паэтам, уласцівы і сербскаму фальклору, як уласцівы сербскім народным песням прыём паўтарэння, ці дзесяцісkладовы памер, таксама выкарыстаны аўтарам «Сербскай» песні.

Сапраўдным рускім нацыянальным каларытам прасякнута і «Руская» песня, у якой ажывае праваслаўная традыцыя святкавання Пасхі з яе абавязковым, самым любімым у моладзі атрыбутам – цалаваннем. Яна імітуе адну з найбольш адметных жанравых разнавіднасцей рускіх народных песень, звязаных з харэаграфіяй – карагодную песню:

Я, дзяўчынушка, ў карагод пайшла
Ды са ўсімі там павіталася.
Ах, са ўсімі там павіталася,
Я са ўсімі цалавалася,
Толькі з мілым пастыдалася.

Працуючы над песнямі «Украінскімі», М. Багдановіч

звяртаецца да выключна украінскага жанру народнай паэзіі – каламыйкі (назва паходзіць ад прыкарпацкага горада Каламыя, у ваколіцах якога ўзніклі гэтыя прыпеўкі, а таксама аднайменны танец) і стварае вершы, ідэнтычныя як па форме, так і па зместу гэтым унікальным песенным мініяцюрам:

У каго ты, дзяўчынанька, тварай удалася?
Ці то ў бацьку, ці то ў матку, ці ў суседа Яся?

Стаў хлапчына ля дзяўчыны, каламыйку грае,
На дзяўчыніны істужкі нешта пазірае.
Ды не так ён на істужкі, як на тыя вочы,
Як на тыя, браце, вочы, што цямней ад ночы.

Наследаванне народна-песенным традыцыям сербаў, рускіх і украінцаў, тонкае адчуванне беларускім паэтам асаблівасцей светапогляду гэтых народаў тлумачыцца іх блізкасцю з беларускай культурай, агульнымі славянскімі каранямі. Але з такой самай віртуознасцю М. Багдановіч стварае адпаведнікі песен народаў, далёкіх ад беларусаў і геаграфічна, і ментальна. Так, песня «Скандынаўская» і сваёй будовай, і зместавым напаўненнем нічым не адрозніваецца ад арыгінальных балад скандынаўскіх народаў: паэт выбірае характэрны памер – спалучэнне адзінаццацікладовага радка з васьмікладовым, уключае традыцыйныя рэфрэны, выкарыстоўвае распаўсюджаны матыў гібелі двух закаханых – юнака Аскара, які загінуў у бітве і дзяўчыны Інгеборг, якая кінулася ў мора, даведаўшыся пра смерць нарачонага:

Была Інгеборг, як сасонка, страйна,
- Так вецер суворы пяе -
І горкую долю спаткала яна.
- Шкада нам, шкада нам яе.

У песнях «Іспанскіх» М. Багдановіч таксама вельмі дакладна і тонка з дапамогай тыповых для рамансу мастацка-выяўленчых сродкаў перадае атмасферу гэтай краіны, дух і тэмперамент іспанскага народа:

«Найяснейшая сіньёра.
Правялебнейшая донна,
Донна Клара, донна Клара,
Загубілі вы мяне!
Ах, без вас і дзень, як поўнач,
З вамі — поўнач, быццам дзень.
Донна, донна! Вы узялі
Ад маіх слядоў зямлі
І зрабілі нагаворы
З чарадзейных чорных кніг».

Гэтак жа натуральна выглядаюць і бадай самыя экзатычныя песні ў цыкле – «Японскія», напісаныя ў форме танкі, традыцыйнай для японскай паэзіі:

Ах, як спявае
Сінявокая птушка
Ў муках кахання.
Сціхні, птушачка, сціхні,
Каб не тамілася я.

Здзіўляюць непадробным усходнім каларытам і песні «Персідскія», у якіх М. Багдановіч па-майстэрску наследуе лепшыя ўзоры персідскага паэтычнага фальклору, захоўваючы ўсе яго мастацкія атрыбуты:

Я ўсё забыў на свеце і ведаю адно:
Зюлейка маладая, што старае віно.
Я ўжо упіўся ёю, — цяпер віном уп'юся...
Паглядзім, хто хмяльнейшы: Зюлейка ці яно?

Як бачым, цыкл «Песні», створаны паводле фальклорна-эстэтычных традыцый таго ці іншага народа, істотна ўзбагачае айчынную літаратуру новымі формамі, стылістыкай, іншымі выяўленчымі сродкамі. Разам з тым «Песні» сталі яскравым сведчаннем шырокіх, фактычна неабмежаваных магчымасцей беларускай мовы, у чым і заключалася задума дадзенага цыклу, на высокім узроўні рэалізаваная Багдановічам-інтэрпрэтатарам.

Анатоль БРУСЕВІЧ, дацэнт, кандыдат філалагічных навук

12 правил молитвы

1. У хорошей молитвы всегда надежный первоисточник

В большинстве молитвословов находятся молитвы, написанные святыми людьми и проверенные многовековым опытом практики церковной жизни. Эти молитвы помогают настроить душу на верную тональность общения с Господом Богом и святыми. Но часто люди ищут «простых» и «доступных» молитв, через которые рассчитывают решить какие-то личные проблемы.

Немалая часть молитв, нацеленных на удовлетворение тех или иных практических нужд — например, о рождении детей, о замужестве, об успехе на работе, — была написана именно в ответ на такой запрос. Совершенно неочевидно, что авторы этих молитв — святые, духовно опытные люди. Едва ли не все «проверенные опытом» молитвы имеют автора. А в последнее время «анонимных» молитв, составленных непонятно кем и непонятно где, написанных зачастую с грубейшими догматическими ошибками и с неправильными нравственными, духовными установками, становится все больше.

На книгах, в которых печатаются молитвословия, должен стоять гриф «Рекомендовано к публикации Издательским Советом Русской Православной Церкви». Этим грифом сама Церковь гарантирует, что содержание молитв соответствует традиции духовной жизни православной Церкви. Можно также встретить книги с грифом «Допущено к публикации Издательским Советом Русской Православной Церкви». Такой гриф означает, что ничего, нарушающего внутренний мир человека или противоречащего христианскому вероучению, в этом молитвослове не будет, но при этом в нем можно встретить молитвы, которые не имеют общецерковного признания.

Молитвы, найденные в Интернете, обязательно проверяйте по печатным изданиям, в которых есть эти грифы. Есть множество сайтов, распространяющих молитвы весьма сомнительного содержания.

2. Не стоит увлекаться поиском новых молитв

Важно помнить, что самая главная и самая нужная молитва христианина — евхаристическая (то есть центральная и наиболее важная часть Литургии, во время которой совершается таинство Божественной Евхаристии). Это не выпрашивание у Бога каких-то благ для себя и для своих близких. Это соучастие в становлении Царства Божия здесь и сейчас — что и происходит, когда мы служим Литургию, когда причащаемся, когда становимся способными вместить в себя огонь Божества и нести его окружающему нас миру. Человек, который любит и понимает службу, не будет заниматься поиском или придумыванием каких-то новых молитв, чтобы удовлетворить какую-нибудь свою конкретную просьбу, потому что все то, о чем человек может просить у Бога, — и даже больше — есть в наших богослужениях.

3. Совместную молитву стремитесь совершать в стенах храма

Совместные молитвы, или так называемые молитвы по соглашению, вне стен храма возможны и желательны в двух случаях: первое, если это молитва «малой Церкви», семьи, и второе — если по тем или иным причинам нет возможности помолиться в храме (болезни, дальние расстояния и прочее). Если же люди без серьезных оснований, без благословения священника собираются у кого-то на квартире или договариваются читать молитвы в одно и то же время, возникает вопрос: почему нельзя сделать это в храме, во главе со священником?

Важно понимать: в прямом смысле слова по соглашению мы молимся, когда приходим в храм на службу. Мы собираемся «в церковь» (1 Кор 11:18) — и через совместную молитву, участие в Литургии, становимся евхаристической общиной. Не стоит также забывать, что кроме главной, литургической, молитвы, в храмах совершаются молебны, акафисты, панихиды и другие богослужения, которыми тоже не стоит пренебрегать.

4. Результат молитвы — смирение и послушание, а не самодовольство и эгоизм

По своей природе молитва должна приближать человека к Богу. Что это значит? Бог Свят. Соответственно, приближение к Богу — это и есть приближение к святости. Плод настоящей, правильной молитвы будет выражаться в появлении двух вещей. Первая — желание слушаться Бога, то есть послушание. Вторая — смирение, то есть понимание своего бессилия в деле спасения, и острая потребность помощи Божией во всех иных делах. Смирение — это не самоуничижение, не удовольствие от того, что ты чувствуешь себя всегда и во всем виноватым. Это устремленность от себя к Богу и предание себя в руки Божии с тем, чтобы Он пришел и начал управлять твоей жизнью так, как Он считает нужным.

Если человек в результате своего моления становится самодовольным, эгоистичным и в нем не разрушается кокон самодостаточности — это неправильная, ложная молитва.

5. В молитве не может быть самовозбуждения

Если во время молитвы мы впадаем в излишнюю эмоциональность, слезливость, состояние умиленности, «душевности» — вполне возможно, что мы на прямом пути к тому, что в Православии называется «прелестью» — состоянию духовного «ко-

роткого замыкания» на самом себе, самообольщению. В таком состоянии может показаться, что, раз молитва так нас умиляет, значит, мы уже духовно исцелены и близки к святости. К подобным искажениям человека нередко подталкивает дьявол — чтобы лишить спасительного плода правильной молитвы. Конечно, в молитве случаются и особые, возвышенные состояния — когда сердца человека касается Божественная благодать, — но эти состояния не могут быть «спрогнозированы» или тем более достигнуты искусственным путем самовозбуждения.



6. Молитва не должна приводить человека в состояние экстаза

Не стоит объяснять, что «танцы с бубнами» во время чтения молитв недопустимы. Важнее будет сказать о том, что нельзя заниматься механическим, постоянным, бессмысленным повторением какой-то молитвы, без понимания ее содержания, без покаянного чувства, подобно чтению мантр или заклинаний — до тех пор, пока не наступит состояние экстаза, измененного сознания.

7. Молиться лучше перед святыми иконами

Возможно, не все знают — но в духовной традиции Православной Церкви не принято молиться с закрытыми глазами — если только в этом нет какой-то особой необходимости. Ум не терпит без-образности. Когда мы ни на что не смотрим, наш ум начинает создавать различные образы и представления. В каких-то случаях это может быть даже очень приятно — но если мы таким образом молимся, мы легко можем увлечься, и тогда наша молитва уйдет в мечтательную, фантазийную область. Именно поэтому существуют святые иконы, взирая на которые, мы направляем нашу мысль к Тому, к Кому мы и обращаемся.

8. У молитвы должен быть адресат

Такими с позволения сказать «адресатами» могут быть Господь Бог, в Святой Троице прославляемый, Пречистая Богородица, святые и небесные силы бесплотные. Никакие другие «адресаты» в молитве христианина недопустимы. К примеру, мы не молимся самим усопшим — мы молимся Господу Богу об их упокоении. Мы не можем обращаться к «матушке сырой земле», к голубому небу, зеленой травке, огню — и всему тому, что можно встретить в языческом ритуале. Даже если вы читаете молитвы с людьми вроде бы церковными, православными, но встречаете нечто подобное — необходимо остановиться и указать на недопустимость этого. К христианству такие «молитвы» не имеют никакого отношения.

9. Молитва не может ставить условий Богу

Молитва — это возможность словесного общения с Богом, которая есть только у человека. Да, все творение славит своего Творца, но лишь человеку дана исключительная возможность обращаться к Богу разумным словом. Молитва — это, прежде всего, общение между человеком и Богом. Но если в молитве человек начинает ставить условия Господу Богу — в ней будет больше языческого магизма, нежели христианского страха Божия и благоговения.

10. В молитве не может быть радости за чужие беды

Основных тональностей молитв — три. Это благодарение или прославление, прошение и покаяние. Всё, что выходит за пределы этого, всё, что является результатом страстного, гневного или обиженного состояния человека — совершенно недопустимо в молитве христианина. К примеру — желание отмщения, проклятия или просьба о том, чтобы Бог наказал какого-то человека, злорадство, ложная благодарность Богу за то, что послал человеку то или иное несчастье и другое подобное.

11. Молитва не должна быть формальной

Нельзя вычитывать святые слова абы как, ради того, чтобы поставить галочку: «я отчитался». Если молиться не хочется, если кажется, что на это нет времени, сил, возможности — в таком случае лучше не вычитать полного правила, лучше уделить молитве меньше времени — но обратиться к Богу искренне, как следует. Однако отмечу, что сокращение молитв не должно становиться правилом.

Святые отцы говорили так: Бог не услышит те молитвы, которые мы сами не слышим. Понятно, что Господь знает все наши прошения еще до того, как мы начнем молиться — но если мы невнимательны, если мы безразлично вычитываем молитвы, просто чтобы выполнить некий обряд, некую формальность — разумеется, ценность наших слов близка к нулю.

12. Молитва не может быть бессмысленной

Прежде чем обратиться к Богу или к святым, мы должны хотя бы немножко подготовиться, поразмышлять о том, к кому мы направляем наши прошения и в чем их суть. Часто люди с многолетним опытом пребывания в Церкви настолько привыкают к молитве, что начинают читать ее автоматически. А от повторения слов, смысл которых абсолютно не понятен или «замылен» их привычностью, молитва сильной не станет. Молитва — это не магическое заклинание, которое само по себе обладает особой силой. Она не может быть бессмысленной, бездумной. Апостол Павел говорит: Стану молиться духом, стану молиться и умом; буду петь духом, буду петь и умом (1 Кор 14:15). Необходимо стараться заключать ум в слова молитвы.

протоиерей Павел
ВЕЛИКАНОВ
foma.ru

«Гродненские епархиальные ведомости» издаются по благословению Высокопреосвященнейшего Артемия, Архиепископа Гродненского и Волковысского

Учредитель: Гродненская епархия

Главный редактор:
Дмитрий Павлюкевич

Компьютерная верстка:
Дмитрий Павлюкевич

Корректор:

Светлана Павлюкевич

Редколлегия:
протоиерей Анатолий Ненартович
протоиерей Александр Велисейчик
протоиерей Александр Железный
протоиерей Александр Хомбак
иерей Иоанн Велисейчик
иерей Владимир Борисевич
протодиакон Иоанн Авсиевич

Газета зарегистрирована Министерством информации Республики Беларусь
Регистрационное свидетельство №1358 от 30 апреля 2010г.

«Одобрено Синодальным информационным отделом Русской Православной Церкви»
Свид. №189 от 2 декабря 2011г.

Издается ежемесячно на русском и белорусском языках
Объем- 3 усл. печ. листа
Тираж 1100 экз.

Адрес:
230023, г.Гродно, ул. Горького, 2

Адрес для писем:
230023, г.Гродно, ул.Ожешко, 23,

тел. (8-0152) 77-06-86

Наш адрес в Интернете:
http://www.orthos.org
E-mail: gev@prihod.info

Подписной индекс 63609
Для предприятий 636092

Цена договорная
Газета набрана и сверстана в редакции «ГЕВ»

Отпечатано в ГОУПП Гродненская типография
230025, г. Гродно, ул.Полиграфистов, 4.
ЛП №02330/39 от 27 03 2014 года

Сдана в набор 05.01.2017
Подписана в печать(16:20) 05.01.2017
Подписана в свет 06.12.2016

№1, 2017

Заказ №54